# “Клубнічка” з Любаншчыны



Унікальны беларускі эратычны фальклор беражліва захоўваюць у гэтым куточку Беларусі

**Аўтэнтычнаму гурту “Глыбокія крыніцы” з вёскі Закальное Любанскага раёна пад сілу разварушыць і састарэлых даследчыкаў, і занудных офіс-менеджэраў, болей таго, нічога не каштуе прымусіць іх пачырванець. Адзіныя ў нашай краіне захавальніцы ўнікальнай спадчыны — беларускага эратычнага фальклору — свае фрывольныя песенкі ўключаюць у неафіцыйную праграму. Ансамблю нададзены высокі статус гісторыка-культурнай каштоўнасці, таму на святах, пасольскіх прыёмах і музычных фестывалях галасістыя бабулькі часцей выконваюць менш шокавыя, але самабытныя творы народнага мастацтва.**



## Атэлы і Эсмеральды

Нягледзячы на гуллівасць тэкстаў эратычных вершаў, песен, баек і частушак, пахабнімі гэтыя вынаходніцтвы вуснага народнага мастацтва ніколі не лічыліся. Іх распявалі на вяселлях, заручынах, дзявочніках, ды і проста, калі хацелася прыцягнуць да сябе ўвагу ці кагосьці падражніць. Тэма сэксу і кахання была моцна звязана ў свядомасці нашых продкаў, ніякага табу на яе не накладвалася. І калі ў Сярэднявеччы ці ў СССР бяседы ніжэй пояса вяліся выключна шэптам, то ў нашым краі блакітных азёр і густых лясоў усё інтымнае разглядалася як справа радасная і прыемная для абодвух бакоў.

— Наш рэпертуар склаўся не адразу, — распавядае мастацкі кіраўнік “Глыбокіх крыніц” Надзея Мірэйчык. — Ішоў 1991 год, я толькі інстытут культуры скончыла. Час адраджэння. Даведалася, што ў савецкі час тут склаўся дзіўны закальнецкі хор, які потым распаўся. Пайшла я па вёсцы бабулек ізноў збіраць. Як успомню гэтыя гвалты! Кагосьці муж не пушчаў: што за гаспадыня, маўляў, якая на гастролі ездзіць?! Агарод, скаціна на кім застанучца? Адзін мужык сваю жонку лупцаваў за тое, што яна спявяць да мяне хадзіла. Яна і перастала. Сказала мне: калі памрэ — тады завітаю. Рэўнасць — гэта страшна. Бывала, і чарку мужыкам паабяцаю, каб рэпетыцыю зладзіць...

## Музыка іх звязала

На шчасце, такія праблемы былі не ва ўсіх. Яўгенія Антонаўна Сячэня пражыла са сваім мужам Рыгорам шэсцьдзесят гадоў. Пазнаёміліся яны адразу пасля вайны. З фронту хлопец вярнуўся не толькі з медалём, але і з новымі песнямі. Пасяліўся па суседству. У сям'і бабы Жэні быў гармонік — дык на глебе творчасці і сышліся.

— Мой Рыгор любіў спяваць, — узгадвае Яўгенія Антонаўна. — Спачатку з намі на рэпетыцыі хадзіў, а пасля часу не стала. Трэба было дзетак падымаць, у калгасе рабіць. Ён цялят даглядаў. Але ўсё роўна музыку не пакідаў, мы заўсёды спявалі дома. Шмат песень, якія мы зараз выконваем, я ведаю ад мужа. Года не прайшло, як ён памёр. Вельмі сумна мне стала. Як заспяваю, дык увесь час яго ўспамінаю.

Кансерваторый у “Крыніцах” ніхто не канчаў, песні ніадкуль не перапісваў. Усе словы і музыку яны чулі ад сваіх матуль і бабуль.

*Эх, чобаты, чобаты вы мае!*
*Павесіла чобаты на ізбе,*
*Сама сябе ўдарыла па...*
*Папе здзелалі бацінкі!*
*Не бацінкі — паўбацінкі!*
*Мама ходзіць па ізбе,*
*Б'юць бацінкі па...*
*Папе здзелалі бацінкі...*

## Па асобнай праграме

Бабулькі задаволеныя: усё часцей іх запрашаюць на прыватныя святы і карпаратывы. Выйсці на абласную ці раённую пляцоўку з некаторымі песнямі не дазволяць: кожнаму твору сваё месца. Бізнесменам, нап-
рыклад, даспад
“клубнічка”, асабліва ў та
незвычайным выкананні.

*А ў нашага зу... Эх, Зуя!*
*Цячэ вада з ху... Эх*
*хутара да ў наша сяло!*
*А ў нашага дзя... Эх, дзя*
*Да ўсе дзеўкі бля...*
*бляхаю таргуюць яны!*

Не ўсе творы з сексуа
ным падтэкстам вершаван
Ёсць і байкі.

*Убачыла дзіця на прыпе*
*сушыцца льняное сем'я і ка*
*“На прыпечку сем'я — ...бл*

Хто сапраўды з'яўляе
стваральнікам гэтых слоў і
зыкі, нам ужо не даведа
Хутчэй за ўсё гэта
праяўлення масавай народ
творчасці. Тым не менш
застаецца фактам. Нідзе, а
мя Любаншчыны, такіх пес
нават падобных на Белару
выконваюць. Час заявіц
аўтарскіх правах! Тым бо
што з касетамі, на якіх запі
бабульчыны галасы, здар
ся сапраўдная дэтэкты
гісторыя: іх таемным вобра
укралі. Таму на камеру ц
бабулі спяваць адмаўляю
каб не раскідацца эксклюзі
Так што сачыце за афішамі
ад часу “Глыбокія крын
прыязджаюць ў Бела
дзяржаўны ўніверсітэт ку
ры і мастацтв, дзе іх канц
праходзяць пры аншлагу.

**Кацярына ГАБЫШ**
**Максім ПРУПАС ( фота),**

Репозиторий БГУКИ